# Адкуль Гудзевічы



***Некалі тут, дзе зараз ляжыць наша вёска, знаходзілася бойкая дарога з Гродна на Беласток. Насыпалі тракт не адзін год і не адна тысяча людзей: ад вёскі да вёскі рабілі адны людзі, далей – другія, гэтак і цягнулася паволі дарога наперад. Рабілі яе сумленна, на стагоддзі, нібы адчувалі, што многае давядзецца пабачыць ажыўленаму шляху, што многа на ім і крыві, і поту, і слёз пральецца.***

***Старыя людзі гаварылі, што яшчэ не так даўно толькі і чуваць было, як ляцелі па шляху коні, як паволі сунуліся вялікія абозы ці віхурай знікалі з вачэй запрэжаныя чацверыком ці шасцерыком экіпажы.***

***Згадвалі яшчэ, што калі ноччу імчалі коні ці якія фурманкі, то даволі часта, каб не збіцца з дарогі, на шыю коням вешалі званочкі. Вось яны і звінелі-гудзелі, пераліваліся ўсялякімі галасамі. Адтуль, маўляў, і пайшла назва нашае вёскі – Гудзевічы, бо пастаянна гуло-гудзела.***